ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
19
САКАВІКА
ЧАЦВЕР
№ 11 (1311)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

"Беларускі універсітэт"
## тэлетайп
• Учора • Сёння • Заўтра •

### НА ФІЗІЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

пачаў працаваць лекторый «Сучасныя праблемы фізікі». Двойчы ў месяц студэнты будуць знаёміцца з актуальнымі пытаннямі розных галін фізікі. На першым пасяджэнні з тэмай «Цеплафізічныя праблемы ў лазернай тэхніцы» выступіў член-карэспандэнт АН СССР, лаўрэат Ленінскай прэміі Р. І. Салаухін.

А. БАРАН,
член савета СНТ фізфака.

### МЕСЯЧНІК ПА АХОВЕ

працы праходзіць у НДІ фізіка-хімічных праблем. У ходзе яго правядзення супрацоўнікі імкнуцца ўзмацніць бяспеку навукова-даследчых работ, дабіцца паляпшэння працоўнай дысцыпліны, чысціні і парадку ў лабараторыях, эканоміі электрычнай энергіі.

М. ЛАХВІЧ.

### НА ЗАКЛІК ЧАСОПІСА

«Смена» дапамагчы сабраць бібліятэку дзецям таёжнага горада Урэнгоя горача адгукнуліся студэнты 1-й групы трэцяга курса механіка-матэматычнага факультэта. Імі сабрана 100 кніг.

Н. МАТУСЕВІЧ,
студэнтка мехмата.

### СПРАВАЗДАЧА ГНК

аб рэйдзе-праверцы работы студсавета і каменданта інтэрната № 1 заслухана на сумесным пасяджэнні партыйнага бюро і групы народнага кантролю гістарычнага факультэта. Адзначана станоўчая работа студэнцкага савета.

Л. МІРОНЧЫКАЎ,
адказны за жыллёва-бытавы сектар ГНК гістфака.

### З ЛЕКЦЫЯЙ

«Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча Польшчы» перад студэнтамі і супрацоўнікамі механіка-матэматычнага факультэта выступіў дацэнт кафедры міжнароднага рабочага руху вышэйшай партыйнай школы А. А. Чалядзінскі.

В. ЕФІМЕНКА.

### СПАРТЫЎНЫ ВЕЧАР

правялі студэнты-матэматыкі. За актыўны ўдзел у спартыўным жыцці факультэта лепшыя спартсмены ўзнагароджаны граматамі і каштоўнымі падарункамі. Сваё майстэрства прадэманстравалі гімнасты Юрый Харын, Алена Яцук, Аляксандр Цітоў.

М. ЖУРАЎКОЎ.

# ТАБОЙ ГАНАРЫМСЯ ПА ПРАВУ

**НЯДАЎНА АДБЫЎСЯ ЎРАЧЫСТЫ СХОД, ПРЫСВЕЧАНЫ ЎРУЧЭННЮ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ПЕРАХОДНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА МІНІСТЭРСТВА ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ СССР І ЦК ПРАФСАЮЗА РАБОТНІКАЎ АСВЕТЫ, ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ І НАВУКОВЫХ УСТАНОЎ ЗА ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ І ЯКАСЦІ ІДЭЙНА-ВЫХАВАЎЧАЙ, ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЙ І НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ, ПАСПЯХОВАЕ ВЫКАНАННЕ ЗАДАННЯЎ 1980 ГОДА І ЗА ПЕРАМОГУ ВА УСЕСАЮЗНЫМ СПАБОРНІЦТВЕ.**

**ВОСЬ ШТО ПАВЕДАМІЛІ НАШЫ СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ КАРЭСПАНДЭНТЫ.**

У актавай зале універсітэта пануе прыўзняты настрой, святочная атмасфера. Тут сабраліся выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты — усе тыя, хто ўнёс свой уклад у скарбонку агульных здабыткаў, чыёй нястомнай працай здабыта перамога. Пад апладысменты на сцэну падымаюцца прадстаўнікі рэктарата, грамадскіх арганізацый, ганаровыя госці. Сакратар партыйнага камітэта універсітэта дацэнт М. Г. ЕЛІСЕЕЎ аб'яўляе ўрачысты сход адкрытым.

На трыбуне намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, член-карэспандэнт АН СССР І. М. МАКАРАЎ:

— Сустрэча з творчым калектывам Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна — адной з перадавых вышэйшых навучальных устаноў краіны — заўсёды радасная падзея. Сёння да гэтых пачуццяў прыбаўляецца глыбокае задавальненне, звязанае з ускладзеным на мяне калегіяй Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і прэзідыумам ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў ганаровым і прыемным даручэннем — уручыць калектыву вашага універсітэта пераходны Чырвоны сцяг за дасягнутыя поспехі ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве ў 1980 годзе.

Перад калектывамі вышэйшай школы, як і перад усімі працоўнымі нашай краіны, XXVI з'езд адкрыў сапраўды натхняючыя перспектывы. Мы ўсе знаходзімся зараз пад уплывам рашэнняў з'езда, даклада на ім Генеральнага сакратара Цэнтральнага Камітэта КПСС таварыша Леаніда Ільіча Брэжнева і абдумваем шляхі рэалізацыі пастаўленых у дакладзе задач.

Такіх задач, як вы ведаеце, у Справаздачным дакладзе адзначана чатыры. Гэта замацаванне сувязі ВНУ з вытворчасцю, паляпшэнне якасці выкладання, больш поўнае выкарыстанне навуковага патэнцыялу вышэйшай школы, удасканаленне планавання падрыхтоўкі спецыялістаў. Усяго чатыры пытанні, аднак настолькі кардынальных, што іх рашэнне закранае ўсе бакі дзейнасці сістэмы вышэйшай адукацыі.

Указаныя задачы — не навіна для калектываў вышэйшых навучальных устаноў, якія ўжо тры пяцігодкі вялікую ўвагу ўдзяляюць павышэнню якасці сваёй працы. Аднак рашаючы крок намі яшчэ не зроблены, мы толькі набралі для яго сілы, каб зрабіць яго ўпэўнена, шырока і дастойна. Але цяпер — цяпер гэты момант наступіў, а нашу падрыхтаванасць да яго будзе правяраць жыццё, ацэньваць гаспадарчая практыка.

Калектывы вышэйшых навучальных устаноў ударнай працай адказваюць на клопат партыі і ўрада. Можна смела сказаць, што вышэйшая школа і ў 1980 годзе, і ў цэлым за гады дзесятай пяцігодкі папрацавала нядрэнна.

І вельмі прыемна, што ў ліку правафланговых Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва першае месца займае калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Прысуджэнне пераходнага Чырвонага сцяга — гэта прызнанне вялікага працоўнага ўкладу выкладчыкаў, навуковых работнікаў, інжынераў, усяго калектыву ў здзяйсненне задач дзесятай пяцігодкі. Гэта высокая адзнака арганізатарскай і палітычнай работы кіраўніцтва універсітэта, партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый. Гэта сведчыць аб тым, што універсітэт ідзе наперадзе, і па ім павінны раўняцца іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы.

Выконваючы даручэнне калегіі міністэрства і прэзідыума ЦК прафсаюза, мне дастаўляе вялікае задавальненне сардэчна павіншаваць усіх, хто сабраўся у гэтай зале, і ўвесь калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта з ганаровай і заслужанай узнагародай.

Можна быць упэўненым, што гэты сцяг з'явіцца новай крыніцай натхнення ў шматграннай рабоце калектыву універсітэта па далейшаму ўдасканаленню вучэбна-выхаваўчага працэсу, павышэнню эфектыўнасці навуковых даследаванняў, паляпшэнню ўсёй дзейнасці калектыву ў выкананні задач, якія паставіў перад намі гістарычны XXVI з'езд роднай Камуністычнай партыі.

А цяпер дазвольце мне выканаць ганаровую і прыемную місію і ўручыць вам Чырвоны сцяг.

Пад бурныя апладысменты намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР, член-карэспандэнт АН СССР І. М. Макараў уручае Чырвоны сцяг.

Потым з заслужанай узнагародай калектыў універсітэта павіншаваў міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР прафесар М. М. МЯШКОЎ.

(Заканчэнне на 2-й стар.).



# ТАБОЙ ГАНАРЫМСЯ ПА ПРАВУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

На трыбуне сакратар партбюро фізічнага факультэта дацэнт Н. М. ХАЎРАТОВІЧ:

— Дасягненні БДУ — гэта таксама рэзультат пастаяннага клопату партыйных арганізацый універсітэта і факультэтаў, партгруп і кожнага камуніста аб развіцці і ўдасканаленні сацыялістычнага спаборніцтва. Палажэнне аб сацыялістычным спаборніцтве, якое існуе ва універсітэце, улічвае не толькі вытворчую дзейнасць, але і стан выхаваўчай работы, прычым роля апошніх паказчыкаў вельмі высокая.

На нашым фізічным факультэце, які тройчы за гады пяцігодкі выходзіў на першае месца ва універсітэце, здзяйсняецца творчы, я б сказала, навуковы падыход да арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва. Ідзе пастаяннае ўдасканаленне палажэння. І калі раней яно не абумоўлівала сувязі паміж узятымі абавязацельствамі і канчатковымі рэзультатамі, то існуючае цяпер патрабуе прыняцця максімальна напружаных абавязацельстваў, выключаецца заніжэнне зыходных пазіцый.

Стала традыцыяй паэтапнае падвядзенне вынікаў з шырокай іх агалоскай і аналізам рэзультатаў як у нізавых звеннях, так і на сумесных пасяджэннях партыйнай, прафсаюзнай арганізацый і савета факультэта.

Штогоднае падвядзенне вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва на вытворчых сходах усяго калектыву, якія адбываюцца ва ўрачыстых абставінах, з рытуаламі ўзнагароды пераможцаў, спалучаецца з аналізам яшчэ не ў поўнай меры выкарыстаных магчымасцей і рэзерваў, з прапагандай вопыту перадавікоў.

Мы ганарымся тым, што ў авангардзе сацыялістычнага спаборніцтва ідуць камуністы.

З гонарам выканаць задачы, якія пастаўлены перад вышэйшай школай рашэннямі XXVI з'езда КПСС, — наша баявая праграма, наш абавязак перад Радзімай!

— Мінулы 1980 год стаў для універсітэта важным этапам развіцця навукі і паглыбленага ўдасканалення вучэбнага працэсу, — гаворыць загадчык лабараторыі НДІ ПФП, кандыдат тэхнічных навук, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі І. А. МАЛЕВІЧ. — Калектывам педагогаў і вучоных універсітэта ўнесены істотны ўклад у развіццё фундаментальных і прыкладных даследаванняў, значна павышана эфектыўнасць укаранення навуковых рэкамендацый і распрацовак у народную гаспадарку рэспублікі, краіны, расшыраны ўдзел студэнтаў у творчым працэсе выканання навукова-даследчых работ і вопытна-канструктарскіх распрацовак.

У цяперашні час кожны з нас яскрава ўсведамляе, як у выніку высокаэфектыўнай арганізатарскай і палітычнай работы рэктарата, партыйнай, камсамольскай і прафсаюзных арганізацый універсітэта расшырыўся фронт навуковых даследаванняў па галоўных напрамках навукі, якія выконваюцца ў рамках комплексных праграм АН СССР, АН БССР і народнагаспадарчых планаў рэспублікі, павысілася эфектыўнасць і, што асабліва важна, — якасць укаранення навуковых рэзультатаў у народную гаспадарку. Той факт, што амаль 80 працэнтаў навукова-даследчых работ універсітэта выканана на ўзроўні вынаходніцтваў, што эканамічны эфект ад укаранення навукова-даследчых работ у 3 разы перавысіў эфект папярэдняга года і склаў 22,3 мільёна рублёў, што амаль 25 працэнтаў з агульнай колькасці дыпломных работ выпускнікоў універсітэта рэкамендавана да ўкаранення — сведчыць аб творчым падыходзе і напружанай працы калектыву універсітэта па ажыццяўленню задач, прапанаваных нашай партыяй.

Цяжка ўтрымацца ад пералiку яшчэ многіх лічбаў выканання сацыялістычных абавязацельстваў, якімі мы можам па праву ганарыцца, — адкрыццё ў галіне нейтроннай фізікі; прэміі Ленінскага камсамола Беларусі ў галіне навукі; выданне больш як 120 манаграфій, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў...

Нам яшчэ прадстаіць у спакойнай дзелавой абстаноўцы прааналізаваць сваю работу, крытычна аднесціся да дасягнутага і знайсці рэальныя рэзервы росту, каб прыйсці да 60-годдзя БДУ з яшчэ лепшымі паказчыкамі.

Слова бярэ студэнтка IV курса філалагічнага факультэта Любоў БУЦАЛЕВА:

— Нам, камсамольцам, студэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, асабліва радасна і прыемна сёння ўсведамляць сябе членамі перадавога калектыву, якому выпала шчасце ў выніку ўпартай працы атрымаць пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Саюза ССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, сцяг, які сведчыць аб вялікіх поспехах у сацыялістычным спаборніцтве.

Нам прыемна адчуваць сябе далучанымі да тых вялікіх спраў, якія штодзённа адбываюцца ў нашай краіне і аб якіх шырока гаварылася на XXVI з'ездзе партыі. Атрымаць такую высокую ўзнагароду не вельмі проста, бо за яе вядзецца напружаная барацьба паміж моцнымі калектывамі. І дасягаецца гэта цаной упартай вучобы, актыўным удзелам у творчым навуковым пошуку, у спорце, грамадска карыснай працы. Аднак утрымаць такую ўзнагароду, адначасова памнажаючы і павялічваючы поспехі, намнога цяжэй. І мы, студэнты, гэта вельмі добра разумеем. Па выніках зімовай сесіі з 9538 студэнтаў 1312 атрымалі «выдатна», 4306—«добра» і «выдатна». Трывала ўвайшлі ў жыццё новыя формы выхаваўчай работы — ленінскія залікі, ленінскія ўрокі, грамадска-палітычная практыка. Павышаны інтарэс праяўляюць студэнты універсітэта да грамадскіх навук, вывучэння ленінскай тэарэтычнай спадчыны, гістарычнага вопыту КПСС, да тэорыі і практыкі камуністычнага будаўніцтва.

Кіруючыся запаветамі У. І. Леніна, моладзь універсітэта паспяхова спалучае вучобу з актыўным удзелам у грамадска карыснай працы. У студэнцкім будаўнічым руху за гады дзесятай пяцігодкі прыняло ўдзел больш чым 12 тысяч чалавек. Імі асвоена 32 мільёны рублёў капіталаўкладанняў.

Калі да гэтага часу можна было пагадзіцца з лозунгам студэнцтва «Прымаць пасільны ўдзел у жыцці універсітэта», то зараз хочацца, каб лозунг гэты загучаў ва унісон падзеям часу: «Прымаць актыўны ўдзел», бо проста пасільнага ўкладу цяпер будзе недастаткова.

— Калектыў вучоных-грамадазнаўцаў універсітэта дабіўся пэўных поспехаў у мінулай пяцігодцы, — падкрэсліў у сваім выступленні загадчык кафедры гісторыі філасофіі і логікі прафесар А. С. КЛЯЎЧЭНЯ. — Як паказалі рэзультаты праверкі кафедр грамадскіх навук камісіяй ЦК КПСС і Мінвуза СССР, лекцыі і семінарскія заняткі па грамадскіх навуках чытаюцца і праводзяцца на высокім ідэйна-тэарэтычным і метадычным узроўні, студэнты паказваюць трывалыя і глыбокія веды, узброенасць дыялектыка-матэрыялістычнай метадалогіяй, адданасць ідэалам камунізму.

Паляпшэнню работы грамадазнаўцаў садзейнічае сацыялістычнае спаборніцтва. Хаця крытэрыі сацспаборніцтва маюць патрэбу ў далейшым удасканаленні, яно ўносіць творчы момант у нашу работу, здаровы дух саперніцтва як унутры калектываў кафедр, так і паміж імі. Кафедра гісторыі філасофіі і логікі ў дзесятай пяцігодцы чатыры разы займала прызавыя месцы, у тым ліку два першыя.

Творчае развіццё марксісцка-ленінскай тэорыі на XXVI з'ездзе КПСС горача сустрэта ў асяроддзі студэнцкай моладзі, усіх работнікаў універсітэта. Калектывы кафедр грамадскіх навук пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі прыкладуць усе намаганні, каб зрабіць рашэнні з'езда канкрэтнымі справамі і дабіцца значных рэзультатаў ва ўсіх галінах сваёй дзейнасці ў адзінаццатай пяцігодцы.

Слова прадастаўляецца рэктару БДУ імя У. І. Леніна акадэміку АН БССР У. А. БЕЛАМУ:

— Дарагія таварышы! У гэтую ўрачыстую гадзіну ўручэння нашаму калектыву пераходнага Чырвонага сцяга Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК галіновага прафсаюза першыя словы сардэчнай падзякі мы адрасуем нашай роднай Камуністычнай партыі. Толькі дзякуючы штодзённай увазе да нашага універсітэта з боку ЦК КПБ, абкома, гаркома, райкома партыі мы змаглі дабіцца такіх высокіх паказчыкаў у сацыялістычным спаборніцтве, за што нам ужо другі год запар прысуджаецца першае месца і пераходны Чырвоны сцяг сярод ВНУ краіны.

Нам асабліва прыемна, што гэта ўзнагарода была прысуджана напярэдадні XXVI з'езда КПСС, які вызначыў велічную праграму далейшага развіцця нашай Радзімы. Рашэнне аб прысуджэнні нам першага месца сведчыць аб вялікай плённай працы партыйнай і прафсаюзных арганізацый па выкананню і перавыкананню ўсімі падраздзяленнямі універсітэта сваіх перадз'ездаўскіх абавязацельстваў.

У гэтыя дні мы ўсе знаходзімся пад велізарным уплывам рашэнняў XXVI з'езда КПСС, змястоўнага даклада Генеральнага сакратара нашай партыі, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Л. І. Брэжнева. У гэтых гістарычных дакументах вызначана вялікая роля вышэйшай школы і яе навуковых падраздзяленняў.

І сёння, прымаючы гэты сцяг, мы павінны не супакойвацца на дасягнутых поспехах, а наадварот, у шэрагу выпадкаў карэнным чынам перабудаваць сваю работу ў святле задач, якія паставіў XXVI з'езд КПСС.

Гэта перш за ўсё датычыцца павышэння якасці падрыхтоўкі нашых выпускнікоў.

Слаўная 60-гадовая гісторыя БДУ характарызуецца высокай якасцю падрыхтоўкі спецыялістаў. Са сцен універсітэта выйшла вялікая плеяда выдатных арганізатараў вытворчасці, партыйных і дзяржаўных дзеячаў, дзеячаў навукі, культуры, адукацыі.

Я мог бы доўга пералічваць імёны Герояў Сацыялістычнай Працы, лаўрэатаў Ленінскай, Дзяржаўнай прэмій, прэмій Ленінскага камсамола, народных пісьменнікаў, заслужаных работнікаў вышэйшай школы, народных настаўнікаў.

Аднак сёння, калі мы рыхтуем спецыялістаў, якія ў росквіце сваіх творчых сіл стануць на прыступку XXI стагоддзя, якія будуць адказныя за ўсебаковае развіццё нашай Радзімы, мы не можам супакойвацца на дасягнутым, мы павінны рэзка павысіць эфектыўнасць і якасць педагагічнага працэсу.

Перад калектывам універсітэта, як перад флагманам вышэйшай школы рэспублікі, стаіць задача далейшага ўдасканалення падрыхтоўкі дактароў і кандыдатаў навук, якіх так не хапае ў многіх перыферыйных ВНУ рэспублікі.

Нягледзячы на істотныя поспехі БДУ ў развіцці навукі, нам трэба зрабіць яшчэ шмат, і перш за ўсё ў пытаннях развіцця марксісцка-ленінскай філасофіі, філалогіі, эканомікі, гісторыі.

Прыродазнаўчыя навукі павінны ўдасканальваць свае даследаванні, умацоўваць сувязь з вытворчасцю, павышаць эканамічную эфектыўнасць распрацовак.

Л. І. Брэжнеў у сваім дакладзе сказаў: «Навука павінна быць пастаянным «парушальнікам спакою», паказваючы, на якіх участках намеціліся застой і адставанне, дзе сучасны ўзровень ведаў дае магчымасць рухацца наперад хутчэй, больш паспяхова».

Гэта накладвае асаблівую адказнасць на вучоных не толькі за ўзровень навуковых даследаванняў, але і за стан прадукцыі, якая выпускаецца ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Неабходна ўдасканальваць і ўмацоўваць сувязі універсітэта з АН БССР і іншымі навукова-даследчымі цэнтрамі рэспублікі і краіны.

Рашэнне ўсіх задач, пастаўленых перад БДУ, павінна быць гарманічна звязана з развіццём матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта і паляпшэннем жыллёва-бытавых умоў супрацоўнікаў і студэнтаў.

У заключэнне дазвольце мне ад імя ўсяго калектыву універсітэта горача і сардэчна падзякаваць калегіі Мінвуза СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў за такую высокую ацэнку нашай працы ў 1980 годзе і заверыць, што мы прыкладзём усе свае сілы і веды, каб з гонарам выканаць задачы, якія пастаўлены перад вышэйшай школай у рашэннях XXVI з'езда КПСС, і захаваць гэты сцяг у сценах нашага універсітэта па рэзультатах спаборніцтва ў 1981 годзе — юбілейным для нашага універсітэта.

У заключэнне ўрачыстага сходу адбыўся святочны канцэрт з удзелам народнага ансамбля танца «Крыжачок», ансамбля народных інструментаў.

**А. ЛАЗОЎСКІ,**
**В. САБАЛЕЎСКІ,**
**У. КАПСКІ,**
**В. ШАЧАК.**





У час вучобы ва універсітэце будучыя юрысты глыбока вывучаюць грамадскія навукі. Студэнты-чацвёртакурснікі добра рыхтуюцца да практычных заняткаў і грунтоўна адказваюць на пастаўленыя пытанні.

Фота В. ШАЧАКА.

ІНТЭРВ'Ю З ВЫХАВАНЦАМІ БДУ

# ГАРЭЦЬ ТВОРЧАСЦЮ

**АМАТАРАМ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ ДОБРА ВЯДОМА ІМЯ ЯНКІ СІПАКОВА. НАШ КАРЭСПАНДЭНТ СУСТРЭЎСЯ З ІМ І ПАПРАСІЎ АДКАЗАЦЬ НА НЕКАТОРЫЯ ПЫТАННІ.**

**— Іван Данілавіч, Вы закончылі аддзяленне журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна. Што асабліва запомнілася з тых студэнцкіх гадоў!**

— З радасцю і ўдзячнасцю ўспамінаю свае студэнцкія гады. Тады, у другой палове 50-х гадоў, аддзяленне журналістыкі (факультэта на той час яшчэ не было) літаральна жыло творчасцю, літаратурай. І менавіта ў тыя гады — хто на першым, хто на трэцім, хто на пятым курсе—ва універсітэце вучыліся многія таленавітыя юнакі, якія сёння складаюць гонар нашай роднай беларускай літаратуры: празаікі Іван Пташнікаў, Іван Чыгрынаў, Барыс Сачанка, Вячаслаў Адамчык, Міхась Стральцоў і Анатоль Кудравец; паэты Кастусь Цвірка і Генадзь Бураўкін, Юрась Свірка і Сымон Блатун, Васіль Зуёнак і Уладзімір Паўлаў; крытыкі Адам Мальдзіс, Анатоль Клышка, Анатоль Сабалеўскі, Алесь Яскевіч, Варлен Бечык. Значыць, было з кім пагаварыць, паспрачацца, і ўяўляеце, якімі цікавымі былі нашы спрэчкі!

**— Сапраўды, такое сузор'е імён... А што б Вы маглі пажадаць сённяшняй моладзі!**

— Мне хочацца пажадаць студэнтам сапраўднага творчага гарэння, і будзем спадзявацца, што хутка паявіцца шмат новых талентаў, якімі будзе ганарыцца наша мастацтва.

Інтэрв'ю правёў С. НАВУМЧЫК.

ГАРЫЗОНТЫ КАФЕДРЫ

# Плён калектыўных намаганняў

**У кожнага факультэта свае асаблівасці, свае спецыяльныя дысцыпліны. Аднак ёсць прадметы, абавязковыя для ўсіх, хто збіраецца атрымаць вышэйшую адукацыю, стаць не толькі кваліфікаваным спецыялістам, але і шырокаадукаваным чалавекам, інтэлігентам. Прафесійная вузкасць часам ператвараецца ў абмежаванасць і ўрэшце адмоўна адбіваецца на асноўнай спецыяльнасці. Як часта даводзіцца чуць: «А навошта ж мне замежная мова?»**

**Думаю, што не патрэбна звяртацца да прыкладаў многіх і многіх дзеячаў навукі, культуры, мастацтва, каб даказаць неабходнасць яе вывучэння. Спецыяліст, які валодае замежнай мовай, мае магчымасць дастаткова ўпэўнена карыстацца дасягненнямі сусветнай навукі. Акрамя таго, за кожнай мовай стаіць яе народ са сваёй цікавай гісторыяй, са сваімі вучонымі і мастакамі. Ці не прывабна гэта — разумець іх без перакладчыка?**

Наш расказ—аб кафедры нямецкай мовы. Сёння яна — гэта 29 выкладчыкаў. Нешматлікі калектыў вядзе заняткі на ўсіх факультэтах, усіх формах навучання. Але праграма вывучэння для кожнага факультэта спецыфічная. З улікам яе асаблівасцей выкладчыкі рыхтуюць дапаможнікі, падбіраюць тэксты, праводзяць навуковую работу. Дарэчы, у сучасны момант выкладчыкамі А. А. Савіцкай і В. Б. Коваль заканчваецца падрыхтоўка да друку дапаможніка для фізічных факультэтаў, які будзе выдадзены ў выдавецтве «Вышэйшая школа».

Для студэнтаў многае ў рабоце выкладчыка застаецца быццам «за кадрам». Мы бачым яго толькі ў часы заняткаў. Але ж гэта яшчэ не ўсё. Выкладчык ВНУ — навуковы работнік, метадыст, выхавацель.

Барыс Пятровіч Баркоўскі, загадчык кафедры нямецкай мовы, разгортвае перада мной аб'ёмісты сшытак. У ім крок за крокам пералічана ўсё, што зроблена кафедрай.

— Асноўны напрамак нашай метадычнай работы, — гаворыць Барыс Пятровіч, — падрыхтоўка вучэбных дапаможнікаў. Пішуцца яны з мэтай абнаўлення матэрыялу і ўдасканалення вучэбнага працэсу. У мінулай пяцігодцы падрыхтавана 47 такіх дапаможнікаў. Тэматыка іх — самая разнастайная. Гэта выданні з элементамі праграміравання для выкарыстання ў лінгафонных кабінетах, распрацоўкі для тых, хто толькі збіраецца паступаць у ВНУ, і іншыя.

А вось яшчэ адна старонка дзейнасці кафедры — навукова-практычныя канферэнцыі. Праводзяцца яны штогод, вясной, у дзень нараджэння У. І. Леніна. Пасяджэнне секцыі замежных моў заўсёды праходзіць пры актыўным удзеле кафедры нямецкай мовы. Толькі ў мінулым годзе студэнтамі розных факультэтаў было падрыхтавана 55 дакладаў.

З поспехам выступаюць студэнты БДУ на алімпіядзе «Студэнт і навукова-тэхнічны прагрэс». Усе ВНУ рэспублікі прымаюць у ёй удзел. Універсітэцкія выхаванцы заўсёды паказваюць выдатныя веды па нямецкай мове і выходзяць пераможцамі. У мінулым годзе з трох першых месц два прысуджаны студэнтам БДУ.

Ёсць чым ганарыцца кафедры! За кожнай перамогай, за кожнай лічбай стаіць доўгая і нялёгкая праца выкладчыка. Перамагаюць у конкурсах студэнты, але, у першую чаргу, гэта заслуга педагога. «Словы прыходзяць, калі прадмет напаўняе душу», — вучыў старажытны філосаф. Захапіць сваім прадметам, зацікавіць—вось галоўная мэта тых, хто перадае свае веды. І Барыс Пятровіч называе імёны кандыдатаў філалагічных навук А. Ф. Калевіч, Р. Б. Гармаш, В. М. Галай...

— Усе нашы здабыткі — кафедральныя, калектыўныя, — гаворыць ён і паказвае рукапісы новых, яшчэ не надрукаваных дапаможнікаў, расказвае аб навукова-метадычных семінарах, на якіх выступаюць усе выкладчыкі, з захапленнем гаворыць пра спецыяльныя курсы перакладу з нямецкай мовы на рускую, арганізаваныя для студэнтаў з ГДР; конкурсы на лепшы пераклад сярод старшакурснікаў...

У дасягненнях кафедры — значны ўклад кіраўніка. Вось ужо 18 гадоў дацэнт Барыс Пятровіч Баркоўскі працуе загадчыкам кафедры. На яго творчым рахунку 18 вучэбных дапаможнікаў, 5 навуковых артыкулаў.

Калі слухаў расказ Б. П. Баркоўскага аб кафедры і яе супрацоўніках, на памяць прыйшоў тэрмін, адкрыты паэтам,— «адзінка ўкладвання жыцця». Падумалася, што гэта, напэўна, і ёсць галоўны крытэрый любой працы. За ўсім пачутым адчуваецца гэтае «ўкладванне жыцця». Яно — на старонках шматлікіх дапаможнікаў, ва ўзнагародах і ганаровых граматах, у добрым і пранікнёным голасе выкладчыка, трывалых ведах маладых спецыялістаў.

Р. ЛАПУШЫН.

# ЛЕТАПІС БДУ

(Пачатак у №№ 4, 6, 7, 8 і 10).

**1940 год**

**5 студзеня**

У аспірантуры навучаецца 52 чалавекі. За 1938-39 навучальны год абаронена 5 кандыдацкіх дысертацый.

**10 лютага**

Адкрыт гісторыка-археалагічны музей.

**Красавік**

На навуковай канферэнцыі універсітэта заслуханы 71 даклад.

**21—22 лістапада**

Пачатак чытанняў у лекторыі Маскоўскага універсітэта прафесарам Л. А. Арцымовічам (выпускніком БДУ) лекцый па пытаннях атамнага ядра.

**Лістапад**

Створана кафедра палітычнай эканоміі.

У 1940 годзе выдадзена 7 выпускаў «Вучоных запісак» аб'ёмам 9 друкаваных аркушаў.

**1941 год**

**Сакавік**

Савет народных камісараў БССР прыняў рашэнне аб святкаванні 20-гадовага юбілею БДУ ў ліпені.

**Чэрвень**

Ва універсітэце навучаецца 1337 студэнтаў.

**22 чэрвеня**

Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. На прадпрыемствах і ў навучальных установах праходзяць мітынгі. Газеты выйшлі з заклікам: «Грамадзяне і грамадзянкі Савецкай Беларусі, мацуйце рэвалюцыйную дысцыпліну, парадак і арганізаванасць! Павышайце рэвалюцыйную пільнасць! Самаахвярна працуйце кожны на сваім участку народнай гаспадаркі — у гэтым залог поўнай перамогі над ворагам».

**Чэрвень**

У першыя дні вайны 450 студэнтаў і выкладчыкаў з'явіліся на прызыўныя пункты.

**Ліпень**

Супрацоўнікі універсітэта перавезлі большую частку кніг бібліятэкі, экспанатаў заалагічнага музея, архіва ў дом па вуліцы Віцебскай для захавання на перыяд вайны.

За дваццаць гадоў універсітэт падрыхтаваў 5 тысяч 240 спецыялістаў.

Напярэдадні вайны працавала 6 факультэтаў і 33 кафедры. Педагагічную і навуковую работу вялі 17 прафесараў, 41 дацэнт, 42 старшыя выкладчыкі, 28 выкладчыкаў, 23 асістэнты. Усяго 151 чалавек (60 чалавек — выпускнікі БДУ).

У аспірантуры універсітэта навучалася 60 чалавек. За перадваенны час закончыла яе 98 чалавек і здалі кандыдацкія экзамены без адрыву ад вытворчасці 17 чалавек. З 1937 па 1941 год 39 выпускнікоў БДУ абаранілі кандыдацкія дысертацыі.

**28 ліпеня**

Нямецка-фашысцкія захопнікі акупіравалі Мінск.

(Працяг будзе).

● САЦСПАБОРНІЦТВА

# НА ШЛЯХУ ЎДАСКАНАЛЕННЯ

БОЛЬШАСЦЬ прафсаюзных арганізацый кафедр, факультэтаў, навукова-даследчых лабараторый і іншых падраздзяленняў універсітэта ў апошнія гады шмат зрабілі для далейшага развіцця і ўдасканалення асноўных форм арганізацыі і правядзення сацыялістычнага спаборніцтва. Сістэма сацыялістычнага спаборніцтва, якая склалася ва універсітэце, заснована, у першую чаргу, на індывідуальных, асабістых абавязацельствах усіх катэгорый супрацоўнікаў: ад рабочага да прафесара і акадэміка. Пры гэтым адной з важнейшых задач пярвічных прафсаюзных арганізацый з'яўляецца забеспячэнне своечасовай, дакладнай і яснай інфармацыі аб мэтах, умовах і важнейшых напрамках спаборніцтва.

У якасці нагляднага прыкладу шырокага разгортвання індывідуальнага спаборніцтва можа служыць работа прафбюро і прафсаюзных груп біялагічнага, фізічнага і іншых факультэтаў, дзе ў творчым саперніцтве актыўна ўдзельнічаюць дактары навук і прафесары, загадчыкі кафедр і дацэнты, навуковыя супрацоўнікі, лабаранты і рабочыя.

Вялікае значэнне мае таксама шырокае абмеркаванне праектаў асабістых сацыялістычных абавязацельстваў на сходах прафгруп, а калектыўных — на пасяджэннях прафсаюзных бюро. Гэта своеасаблівая «абарона» прымаемых абавязацельстваў дазваляе дабіцца, каб кожны пункт быў больш канкрэтным, дапамагаў знайсці яшчэ не выкарыстаныя рэзервы, павысіць напружанасць абавязацельстваў.

Рэгулярны і своечасовы кантроль за выкананнем прынятых абавязацельстваў, як індывідуальных, так і калектыўных, штоквартальнае адлюстраванне іх вынікаў на стэндах, шырокая прапаганда і абагульненне ўсяго лепшага, перадавога, абмеркаванне і аналіз прычын няўдач асобных падраздзяленняў, пастаяннае ўдасканаленне ўмоў сацыялістычнага спаборніцтва — вось далёка не поўны пералік штодзённай і карпатлівай работы, якую вядуць прафбюро і прафсаюзныя групы ўсіх без выключэння падраздзяленняў і служб універсітэта. І вышэйшай узнагародай за гэтую працу, часам непрыкметную, але такую неабходную і важную, з'яўляецца прызнанне поспехаў калектываў — пераможцаў ва ўнутрыуніверсітэцкім спаборніцтве, а пераходны Чырвоны сцяг Мінвуза СССР і ЦК нашага прафсаюза, які ўручаны, —гэта высокая адзнака работы ўсяго калектыву нашага універсітэта.

Мы далёкія ад думкі, што ўсё ў нас зроблена, што ў арганізацыі і правядзенні сацыялістычнага спаборніцтва дасягнута нейкая мяжа. Пастаянна шукаць, знаходзіць новае, развіваць і ўдасканальваць — вось галоўнае, чым кіруюцца ў сваёй рабоце прафсаюзныя групы і бюро. Натхнёныя рашэннямі XXVI з'езда КПСС, мы прыкладзём усе намаганні, каб у самы бліжэйшы час знайсці яшчэ не раскрытыя рэзервы, новыя метады і формы ў арганізацыі спаборніцтва і максімальна мабілізаваць усю творчую актыўнасць кожнага супрацоўніка універсітэта на паспяховае выкананне і перавыкананне прынятых сацыялістычных абавязацельстваў.

**У. МІКУЛОВІЧ,**
**дацэнт, старшыня прафбюро факультэта радыёфізікі і электронікі.**

● ЛЕКЦЫЯМ — ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ

# ЯШЧЭ РАЗ ПРА ГАЛЁРКУ...

**ПРАЦЯГВАЕМ АБМЕРКАВАННЕ ПРАБЛЕМЫ, УЗНЯТАЙ У МАТЭРЫЯЛЕ «ЦІ ВЕЧНЫ «ШЧАСЛІВЫ БІЛЕТ!»**

У АПОШНІ ЧАС у газеце паявіліся публікацыі, прысвечаныя праблеме эфектыўнага выкарыстання лекцыйнага часу. Паявіліся рэпартажы з апошняй парты, разважанні аб лекцыях, спробы даследавання славутай галёркі. Даследаванні тыя часам носяць настолькі расчулена-заміlabаны характар, што, азнаёміўшыся з імі, так і хочацца ўсклікнуць: «Вось гэта людзі!» І чым яны толькі не займаюцца на сваёй галёрцы: кнігі чытаюць, канцылярска-актывісцкія справы вядуць, запіскі пішуць і г. д. Апускаецца толькі маленькая акалічнасць: усе яны настолькі далёкія ад лекцый, як неба ад зямлі, словы выкладчыка іх вушэй не дасягаюць.

Трэці курс журфака. Ужо — трэці. Здаецца, два дні прайшло, а не два гады праляцела. Уявім: мы — першакурснікі. Як гавораць у студэнцкім асяроддзі, вучыліся вучыцца. Акуратна канспектавалі лекцыі, лавілі кожнае слова выкладчыка. Цяпер мала канспектуем, далёка не ўсе словы ўспрымаем, звычайна аддаём перавагу размовам з суседам. Навучыліся вучыцца? Наадварот, развучыліся, а навучыліся ленавацца, замяняць халоднае «трэба» больш прыемным і жаданым «хачу». Не ўсе такія. Некаторыя запісваюць лекцыі, слухаюць, працуюць. Гэтыя студэнты, відаць, — не аматары бяссонных начэй у час сесіі, ды і на чужы канспект спадзявацца не хочуць.

Галоўны апраўдальны аргумент бяздзейнай часткі курса — спасылка на нецікавыя і сумныя лекцыі. І аўтары некаторых газетных выступленняў на гэтую тэму бездапаможна разводзяць рукамі: маўляў, нічога тут не папішаш. Таварышы дарагія! Ці ж гэта галоўны крытэрый дзейснасці любой лекцыі — цікавая яна ці не? Лекцыя ж не атракцыён у парку адпачынку. Яна патрэбна нам, больш таго — яна наш сённяшні хлеб надзённы. І ці не надта мы стараемся зрабіць гэты хлеб найлягчэйшым? Наогул, я лічу, што няма нецікавых лекцый, а ёсць незацікаўленыя ці абыякавыя людзі.

Яшчэ адзін момант. Не слухаючы лекцый, займаючыся на іх сваімі справамі, мы не паважаем выкладчыка і ўдвая—сябе. Вось і атрымліваецца сітуацыя: лектар вымушаны перапыняць расказ і суцішаць самых палкіх. На трэцім курсе журфака ідзе лекцыя па асновах эканомікі. Аднак не ўсе заняты эканомікай. Дацэнт Эдуард Антонавіч Юшкевіч спыняецца і, як дзяцей, пачынае настаўляць: «Уголас нельга размаўляць. Гэта некультурна, абразліва для выкладчыка». Суцішаюцца. Гэта тыповы выпадак, аднак не заўсёды выкладчык зробіць заўвагу, спадзеючыся, што мае справу з дарослымі людзьмі.

Дарослымі мы называць сябе любім. Лічым сябе самастойнымі, маем свой пункт гледжання на рэчы. Ды толькі святло пасля заняткаў у аўдыторыі не выключана, вокны не зачынены, сталы размаляваны і распісаны, прычым змест «малюнкаў» і надпісаў зусім не «дарослы».

Урэшце, не ў будучых экзаменах справа. У нейкай ступені ёсць сэнс у студэнцкай заўвазе, што экзамен — той жа латарэйны білет. Не будзем цяпер вызначаць працэнт верагоднасці выйгрышу па гэтаму білету, экзаменацыйнаму ці латарэйнаму. Сваёй няўважлівасцю, бесклапотнымі адносінамі да заняткаў сёння мы нешта згубім у сваёй будучай рабоце. Штосьці недаробім, чагосьці недаслухаем, недакажам. Ці не ўспомнім мы тады горкім словам свае студэнцкія гады, цяперашнія «нецікавыя» лекцыі? Давайце падумаем разам.

**П. ЦУНІК,**
**студэнт журфака.**

# ЛЕНІНСКІМ КУРСАМ

**ДА ВЫВУЧЭННЯ ДАКУМЕНТАЎ І МАТЭРЫЯЛАЎ XXVI З'ЕЗДА КПСС У СІСТЭМЕ ПАРТЫЙНАЙ ВУЧОБЫ**

СПРАВАЗДАЧНЫ даклад ЦК КПСС, зроблены Генеральным сакратаром ЦК КПСС таварышам Л. І. Брэжневым, рашэнні XXVI з'езда партыі — дакументы велізарнага ідэйна-тэарэтычнага і палітычнага значэння, якія ўзбройваюць савецкіх людзей веданнем перспектыў грамадскага развіцця, разуменнем вялікіх задач, якія стаяць перад партыяй і савецкім народам.

XXVI з'езд КПСС распрацаваў навукова-абгрунтаваную праграму ўсебаковага развіцця савецкага грамадства, далейшага ўдасканалення сацыялістычнага ладу жыцця, праграму барацьбы за ўмацаванне міру.

Першачарговая задача кожнага камуніста-выкладчыка і супрацоўніка універсітэта — глыбока вывучыць самому і данесці да кожнага студэнта ідэйнае багацце дакументаў і матэрыялаў XXVI з'езда КПСС.

Матэрыялы XXVI з'езда КПСС і XXIX з'езда КПБ будуць вывучацца ў сістэме партыйнай вучобы з сакавіка па чэрвень 1981 года. За гэты час у тэарэтычных і метадалагічных семінарах трэба правесці 4—5 заняткаў, у палітшколах і школах асноў марксізму-ленінізму — 8—10 заняткаў па наступных тэмах: «Міжнародная палітыка КПСС», «Эканамічная палітыка КПСС у перыяд развітога сацыялізму», «Сацыяльна-палітычнае і духоўнае развіццё савецкага грамадства і задачы партыі», «Партыя— авангард савецкага народа».

XXVI з'езд паставіў задачу паляпшэння якасці партыйнай вучобы, павышэння тэарэтычнага ўзроўню і метадычнага майстэрства прапагандысцкіх кадраў. Іменна ад прапагандыста залежыць, гаварыў Л. І. Брэжнеў на з'ездзе, ці стануць нашы семінары сапраўднымі цэнтрамі жывой партыйнай думкі...

З мэтай паляпшэння метадычнай дапамогі прапагандыстам партком універсітэта прыняў шэраг мер. Рэарганізаваны і папоўнены высокакваліфікаванымі выкладчыкамі з вялікім вопытам прапагандысцкай работы метадсавет пры парткоме. Больш цесным і планамерным стала супрацоўніцтва сектара партыйнай адукацыі пры парткоме з бібліятэкай. У пакоі масавай работы бібліятэкі (аўдыторыя 309 галоўнага корпуса) створаны куток прапагандыста, дзе кіраўнікі семінараў і слухачы змогуць азнаёміцца з тэарэтычнымі і метадалагічнымі публікацыямі па матэрыялах XXVI з'езда КПСС. З сакавіка па чэрвень, два разы ў месяц, там будуць праводзіцца кансультацыі для прапагандыстаў і слухачоў сістэмы партыйнай вучобы.

**А. РУСАКОВА,**
**дацэнт, старшыня метадсавета пры парткоме БДУ.**

● З НАШАЙ ПОШТЫ

# СУСТРЭЧЫ НА РАДЗІМЕ

УСПАМІНАЮ нядаўнія сустрэчы ў сябе на радзіме, у Народнай Рэспубліцы Конга.

— Ужо тры гады працую ўрачом у адной з бальніц сталіцы. Вельмі ўдзячны Савецкай дзяржаве, што яна дазволіла набыць мне такую неабходную для маёй краіны прафесію, — сказаў Гастон Банзузі, былы выпускнік Калінінскага медыцынскага інстытута.

Да яго думкі далучаецца Сэсіль Марымука. Яна — выхавацельніца дзіцячага сада.

Больш 13 гадоў кангалезскія студэнты прыязджаюць у СССР вучыцца. Многія з іх вярнуліся на радзіму высокаадукаванымі спецыялістамі, дапамагаюць будаваць новае жыццё, нясуць у масы ідэі міру, дружбы і роўнасці — адметныя рысы Савецкай краіны.

**Педра КУБІК,**
**студэнт II курса факультэта журналістыкі.**

СВЕТ ТВАІХ ЗАХАПЛЕННЯЎ

# «Вясну загукаці...»

САКАВІК два тыдні з марозамі біўся, а лёд ніяк не растане. Людзі ў зацярушаныя снегам футра насы хаваюць. Сумна... Успомнілі філфакаўцы, што ёсць у Беларусі цудоўнае свята «Гуканне вясны». І разам з жыхарамі мікраёна «Зялёны Луг», вучнямі 34-й сярэдняй школы вырашылі дапамагчы сакавіку паклікаць Вясну.

...Збіраюцца ля вогнішча людзі: моладзь, дзяўчаты смяшлівыя, што з самай раніцы свята Вясны чакалі; а стары ў акулярах, мабыць, з магазіна хлеб нёс ды спыніўся, песні пачуўшы, зацікавіўся. Расказаў Вінцэнт Вячорка пра вясновыя святы на Беларусі, нагадаў пра багатую фальклорную песенную спадчыну, што засталася разам з прыгожымі святамі...

Успомніліся песні, што спявалі на ўсе веснавыя святы, — і калі ішло «замыканне зімы» і «адмыканне вясны». Песні, знаёмыя з дзяцінства, тыя, што запісалі на фальклорнай практыцы.

Сёння гукалі вясну разам з філфакаўцамі студэнты мехмата, тэатральна-мастацкага інстытута, інстытута народнай гаспадаркі — шчырыя прыхільнікі роднага мастацтва. Душа ў іх спявае, бо дакранулася да самага святога для нас — спадчыны народнай.

— Нам не трэба афіцыйнай назвы «ансамбль». Мы проста студэнты, збіраемся разам, бо любім спяваць народныя песні і хочам ведаць іх як мага больш,— сур'ёзна папярэджвае нас студэнт III курса філфака В. Вячорка.

Але каб песня гучала, трэба многа працаваць. І дапамагае хлопцам і дзяўчатам набываць прафесійнае майстэрства выпускніца кансерваторыі Ларыса Семаковіч.

Фальклорная група існуе на філфаку каля года. І на спеўкі ходзяць вечарамі ўсё новыя людзі. Хочуць данесці гісторыю роднага краю да кожнага сэрца.

**Г. САЧАНКА.**

● ВІЗІТЫ СЯБРОЎ

# ГОСЦІ З МАСКВЫ

ПЕРАД СТУДЭНТАМІ універсітэта з цікавымі, самабытнымі спектаклямі выступіў музычны тэатр геаграфічнага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава, які быў запрошаны камітэтам камсамола БДУ, а таксама зямляцтвам студэнтаў з ГДР. У саставе трупы тэатра 26 чалавек— студэнты, аспіранты і супрацоўнікі геафака Маскоўскага універсітэта. Тэатр існуе каля 5 гадоў. Цяперашні састаў, у якім ёсць свае драматургі і кампазітары, склаўся прыкладна два гады назад. Асабліва значную работу ў аматарскім тэатры вядуць Георгій Васільеў і Аляксей Івашчанка.



НА ЗДЫМКУ: сцэна са спектакля «Сведкі».

Фота Г. Юрчанкі.

У рэпертуары тэатра эпапеоза «Армагедон будучы, ці асяроддзе, якое мы выбіраем». Масквічы-географы прысвяцілі гэтую оперу праблемам аховы навакольнага асяроддзя. Акрамя таго, яны паказалі цікавую інтэрпрэтацыю вядомай казкі «Прынцэса на гарошыне», у пастаноўцы якой выкарыстоўваліся прынцыпы тэатра ценяў. «Сведкі» — спектакль, прысвечаны Джардана Бруна. У ім быў здзейснены цікавы прыём выканання адной ролі двума акцёрамі, калі адзін іграе на сцэне, а другі агучвае ролю.

І апошняе, з чым выступілі госці, — студэнцкае музычнае шоу «Я люблю універсітэт», прысвечанае 225-годдзю МДУ.

Гледачы адзначылі ў творчасці маладзёжнага тэатра імкненне да пошукаў новага стылю і новых напрамкаў. У планах тэатра на будучыню — пастаноўка оперы-дэтэктыва. Мы спадзяёмся, што новую музычную праграму нашых сяброў мы ўбачым у наступным годзе.

**Петэр МАГАШ,**
**студэнт аддзялення філасофіі гістфака.**

**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

19 сакавіка 1981 г.

Заказ № 482. АТ 01146

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЁЎ